30к-1
2083

# Бібліятэка прапануе

ISSN 1818-4278

11/2011 лістапад

## Паэт красы і гармоніі








Л. ГУШЧЫНСКАЯ
загадчыца сектарам НББ

# Паэт красы і гармоніі

## Новае электроннае выданне Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі прысвечана М. Багдановічу

**Нацыянальная бібліятэка Беларусі (НББ) падрыхтавала мультымедыйнае выданне «Паэт красы і гармоніі», прысвечанае 120-годдзю з дня нараджэння Максіма Багдановіча – выдатнага беларускага паэта-наватара, цудоўнага перакладчыка, крытыка і публіцыста.**




Гэта чацвёрты выдавецкі праект НББ, прымеркаваны да юбілеяў знакавых асоб беларускай культуры і літаратуры для глыбокай і дзейснай папулярызацыі іх творчай спадчыны. У 2007 г. у рамках святкавання 200-годдзя з дня нараджэння знакамітага мастака і кампазітара Напалеона Орды, якое было ўнесена ў Спіс памятных дат ЮНЕСКА, быў выпушчаны дыск «Спадчына Напалеона Орды (1807–1883)». У 2008 і 2009 гг. пабачылі свет яшчэ два мультымедыйныя праекты, прысвечаныя класікам беларускай літаратуры: «Жыве паміж намі дудар наш»: да 200-годдзя з дня нараджэння Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча (1808–1884)» і «Не пакідайце ж мовы нашай беларускай»: да 170-годдзя з дня нараджэння Францішка Багушэвіча (1840–1900)».

Непаўторнае месца ў гісторыі беларускай культуры займае літаратурная дзейнасць Максіма Багдановіча. Ён стаў адным з найвыдатнейшых нацыянальных паэтаў, стварыў у адноўленай беларускай літаратуры пачатку XX ст. свой асаблівы паэтычны свет красы і гармоніі. Як таленавіты перакладчык, крытык і публіцыст, ён узбагаціў беларускую літаратуру новымі формамі і жанрамі.

Нацыянальная бібліятэка заўсёды надавала значную ўвагу даследаванню творчай спадчыны пісьменніка. Прапанаванае выданне – гэта своеасаблівы працяг той шматзначнай працы, распачатай у бібліятэцы ў 50-я гады мінулага стагоддзя руплівай даследчыцай творчасці М. Багдановіча Нінай Барысаўнай Ватацы (1908–1997). Выдатны бібліёграф, літаратуразнаўца, заслужаны дзеяч культуры БССР Н.Б. Ватацы была супрацоўніцай Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (у той час – Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У.І. Леніна ). На працягу ўсяго жыцця яна сістэматычна даследавала творчасць М. Багдановіча, сустракалася з многімі людзьмі, якія мелі дачыненне да паэта, збірала рукапісныя і друкаваныя дакументы, фотаздымкі. Высокім узорам бібліяграфічнай спадчыны можна лічыць складзены ёю паказальнік «Максім Багдановіч» (Мінск, 1977), у якім адлюстраваны творы, аўтографы і шматлікія літаратурна-крытычныя матэрыялы за перыяд 1908–1976 гг.

Электроннае выданне «Паэт красы і гармоніі» ўключае вялікі аб'ём бібліяграфічнай, фактаграфічнай, графічнай і гукавой інфармацыі, звяза-

най з імем і творчасцю М. Багдановіча. Яна згрупавана ў чатыры асноўныя блокі –раздзелы:

- *Творчая спадчына М. Багдановіча (500 бібліяграфічных запісаў, з іх 50 са спасылкамі на алічбаваныя копіі арыгіналаў).*
- *Літаратура пра жыццё і творчасць ( 2000 бібліяграфічных запісаў манаграфічных выданняў і артыкулаў 1908 – 2011гг., з іх 170 са спасылкамі на поўныя тэксты).*
- *М. Багдановіч у мастацтве і мастацкай літаратуры (звыш 500 запісаў, з іх 100 электронных копій твораў выяўленчага мастацтва).*
- *Ушанаванне памяці М. Багдановіча (1917–2011); (звыш 200 фактаў і падзей).*



Асаблівую каштоўнасць першага раздзела прадстаўляюць алічбаваныя копіі прыжыццёвых выданняў пісьменніка. Гэта ў першую чаргу зборнік вершаў «Вянок» (Вільня, 1913) з аўтографам паэта, 4 брашуры: «Братья-чехи» (1913), «Угорская Русь» (1914), «Белорусское возрождение» (1915), «Білоруске відродженне» (1916). Прадстаўлены таксама электронныя копіі акадэмічных выданняў: першага акадэмічнага збору твораў М. Багдановіча, падрыхтаванага Інбелкультам пад рэдакцыяй І. Замоціна, якое выйшла ў свет у 1927–1928 гг. пры вялікай падтрымцы і дапамозе бацькі паэта – Адама Ягоравіча Багдановіча; кнігі акадэмічнага тыпу «Творы. Вершы і апавяданні. Нарысы» (Мінск, 1957); 2-томнага акадэмічнага выдання «Збор твораў» М. Багдановіча (Мінск, 1968). Алічбаваны і самы поўны збор твораў М. Багдановіча ў 3 т. (Мінск, 1991–1995), які быў падрыхтаваны Інстытутам літаратуры імя Я. Купалы НАН Беларусі. Выданне ўключае ўсе вядомыя вершы, апавяданні, пераклады, літаратурнакрытычныя і публіцыстычныя артыкулы, чарнавыя накіды і пісьмы М. Багдановіча.

У перакладах на замежныя мовы М. Багдановіч прадстаўлены бібліяграфічнай інфармацыяй – звыш 150 запісаў на 19 мовах свету: англійскай, французскай, нямецкай, балгарскай, украінскай, польскай і інш.). Некаторыя з улічаных перакладаў алічбаваны, напрыклад, харкаўскае выданне зборніка «Вянок» 1929 г. у перакладзе вядомага ўкраінскага паэта, літаратуразнаўцы і перакладчыка Міхаіла Драй-Хмары.

Безумоўную каштоўнасць і цікавасць прадстаўляюць алічбаваныя матэрыялы з аўтографамі М. Багдановіча. На дыску прадстаўлена 10 аўтографаў, у тым ліку прыжыццёвы зборнік вершаў «Вянок» (1913) з аўтографам паэта, які захоўваецца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, і рукапісны зборнік «Зеленя» з фондаў Літаратурнага музея Максіма Багдановіча.

У другім раздзеле падаецца шырокі спектр бібліяграфічнай інфармацыі, прысвечанай жыццю і творчасці М. Багдановіча, – звыш 2000 запісаў. Ад 170 з іх даюцца спасылкі на алічбаваныя копіі тэксту.

Трэці раздзел дыска прысвечаны адлюстраванню жыцця і творчасці М. Багдановіча ў літаратуры і мастацтве. Так склалася ўжо, што для большасці інтэлігентных людзей нашай Бацькаўшчыны імя Максіма Багдановіча святое. Яго творы надзвычай высокай паэтычнасці і духоўнай прасветленасці, прасякнутыя самотай уласнага жыцця, для многіх і многіх творчых людзей – невычэрпная крыніца натхнення. Па матывах яго вершаў і паэм, фактаў рэальнага жыцця напісаны оперы, песні, рамансы; створаны жывапісныя палотны, акварэльныя і графічныя серыі, скульптурныя кампазіцыі. Таленавітаму і самаадданаму майстру прысвечаны кінаі відэаматэрыялы. Мы імкнуліся як мага поўна гэта паказаць. На дыску прадстаўлена каля 100 электронных копій мастацкіх твораў, зробленых па матывах творчасці паэта, або прысвечаных яго вобразу; уключана бібліяграфічная інфармацыя (60 запісаў) і 16 гуказапісаў песень і рамансаў, урыўкаў з гуказапісаў опер, створаных беларускімі кампазітарамі на вершы паэта; алічбаваны фрагменты з 4 фільмаў (усяго выяўлена 8 кінавідэаматэрыялаў). Прадстаўніча выглядае падборка прысвячэнняў яркай асобе М. Багдановіча. Гэта звыш 200 вершаў і празаічных твораў беларускіх паэтаў і пісьменнікаў: У. Жылкі, У. Дубоўкі, М. Танка, У. Караткевіча, Д. Бічэль-Загнетавай, Я. Янішчыц і многіх іншых.

Інфармацыйна багатым па змесце з'яўляецца раздзел, прысвечаны ўшанаванню памяці паэта ў Беларусі і за яе межамі. Фактаграфічны матэрыял адлюстроўвае шматлікія падзеі і мерапрыемствы, выяўленыя па друкаваных крыніцах і рэсурсах Інтэрнэту, якія адбываліся на працягу XX – пачатку XXI стст. Таксама змешчана інфармацыя аб дзейнасці музеяў М. Багдановіча ў Мінску, Гродне і Яраслаўлі.

Выданне разлічана на вельмі шырокае кола карыстальнікаў, якія даследуюць, вывучаюць ці проста цікавяцца творчасцю М. Багдановіча, беларускай літаратурай, культурай і гісторыяй.

- *Набыць мультымедыйнае выданне можна ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.*